Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Белавушская серэдняя школа”

# Агляд жыцця і творчасці Леаніда Дранько-Майсюка

Падрыхтавала вучаніца 11 “Б” класа
Вабішчэвіч Крысціна


ГАСПОДА

# Біяграфія

- Леанід Дранько-Майсюк нарадзіўся 10 кастрычніка 1957 г. у горадзе Давыд-Гарадку Столінскага раёна Берасцейскай вобласці ў рабочай сям'і. Дзед — Мікалай Дранько, яўрэйскага паходжання, працаваў шаўцом у арцелях у Давыд-Гарадку. Мясцовыя жыхары звалі паміж сабой Мікалая таксама і Майсюк. Яго сына Васіля (бацька Леаніда, нарадзіўся ў 1931 г.) запісалі ў царкоўную кнігу Дранько-Майсюком, па мянушчцы бацькі. Пасля вайны, калі выпісвалі савецкія дакументы на падставе царкоўных запісаў, Васілю выдалі пасведчанне аб нараджэнні з прозвішчам Дранько-Майсюк.

- Леанід Дранько-Майсюк скончыў Давыд-Гарадоцкую СШ № 2 (1974), працаваў на Давыд-Гарадоцкім заводзе слясарна-мантажных інструментаў. У 1975 г. паступіў на завочнае аддзяленне паэзіі Літаратурнага інстытута ў Маскве. У 1976—1978 гг. служыў у  Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі перавёўся на стацыянарнае аддзяленне Літінстытута, які скончыў у 1982 г.
- У 1982—2002 гг. — рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Са жніўня 2002 г. — на вольнай працы.

- Па сканчэнні вучобы ў Літінстытуце, якое адбылося пасля службы ў войску, Леанід пабраўся шлюбам з Вольгай, дачкой Валянціны Шчадрыной, прыхільніцы і перакладчыцы беларускай літаратуры. Але застацца ў Маскве нават думкі не было. І Вольга ні кроплі не сумнявалася, што трэба ехаць у Беларусь. Больш таго, іхняга сына Васіля яна нараджала не ў Мінску, дзе жылі, а на радзіме мужа. Так і стаіць у пашпарце ў менчука Васіля месца нараджэння: Давыд-Гарадок.



# Творчасць

Ужо першы зборнік паэта "Вандроўнік" (1983) адкрыў у нашай літаратуры неардынарнага аўтара са сваім адметным стылем і мастацкім  почыркам, удумлівага, духоўна ўзвышанага падарожніка па родным краі. Другая кніга Л. Дранько-Майсюка "Над пляцам" (1986) зместам звязана з Давыд-Гарадком, роднай вуліцай, бацькоўскай хатай, самімі бацькамі. Нямала вершаў гэтага зборніка звернута да жанчыны.






Першыя вершы надрукаваў у столінскай раённай газеце «Навіны Палесся» ў 1972 годзе. У 1974 годзе выступіў упершыню ў рэспубліканскім друку ( газета «Чырвоная Змена»).


НАВІНЫ Палесся

ПЕРАМОЖЦЫ СПАБОРНІЦТВА НА ЖНІВЕ-96

ПА РЭСПУБЛІЦЫ

ПА РАЁНЕ


№ 75 (5126) НЯДЗЕЛЯ 22 чэрвеня 1941 года

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Выходзіць па нядзелях, серадах і пятніцах

ШЫРЭЙ РАЗМАХ МЕЛІЯРАТЫЎНЫХ РАБОТ

Прафсаюзна-камсамольскі крос

АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ КАЛГАСНАЙ МОЛАДЗІ

Вайна ў Еўропе, Афрыцы і Азіі

У ПЕРАДАВЫМ КАЛЕКТЫВЕ

Пастаянна збіраць металалом

Германскі ўрад прапанаваў ЗША адклікаць свае консульствы

Італьянская нота ЗША

Выканалі поўгадавы план

Пачалося сенакашэнне

БЕЛАПАН

# Кнігі і зборнікі

- Леанід Дранько-Майсюк аўтар 16 кніг, у тым ліку, зборнікаў паэзіі «Вандроўнік» (1983), «Над пляцам» (1986), «Тут» (вершы, паэмы, эсэ, 1990), «Проза радости» (пераклад з беларускай; М.: «Советский писатель»,1991), «Пра тое, як я…» (13 несур'ёзных апавяданняў, 1992), «Акропаль» (паэзія, эсэ, 1994), «Стомленасць Парыжам» (вершы і эсэ, 1995), «Гаспода» (выбранае «Залатая серыя» «Паэзія XX стагоддзя», 1998), «Места і свет» (вершы, 2000), «Паэтаграфічны раман» (вершы, проза, 2002), «Вершы. Каханне. Проза» (выбранае, 2003), «Белая вежа» (разам з Юрыем Кабанковым; вершы, лісты; Уладзівасток, 2004), «Цацачная крама» (кніжка для вялікіх і малых, 2008), «Анёлак і я» (апавяданне, 2009), «Кніга для спадарыні Эл» (проза, вершы, п'еса, 2012), "... Натуральны, як лінія небасхілу" (архіўная аповесць пра Максіма Танка, Мінск, "Кнігазбор", 2017).
- Асобныя вершы Л.Дранько-Майсюка пакладзены на музыку.



- Леанід Дранько-Майсюк удзельнічаў у творчых сустрэчах, дзе раздаваў свае зборнікі з рознымі цікавымі надпісамі.



Спадарыня Таццяна, толькі ваша прыгажосць атуліць маю паэзію нечаканасцю. Л. Дранько-Майсюк. 16 снежня 2004.







Гомель – сталіца неспадзяваных чараў. Л. Дранько-Майсюк.16 снежня 2004.

Няхай зайдросцяць зоры
Мне ўсімі праменямі:
Па цёмным калідоры
Ішоў я, Лена, з Вамі!
Л. Дранько-Майсюк
19 снежня 2008

Хай Вашы чытачы, слаўная бібліятэка Герцэна, ствараюць Вам слаўны настрой!
Л. Дранько-Майсюк
15.10.2009

Аднойчы ў Гомелі я сустрэўся з дзівоснай прыгажуняй. Яе звалі Астра...
Л. Дранько-Майсюк
16 Снежная 2004









Лепшае з напісанага Л. Дранько-Майсюком склала яго кнігі выбраных твораў "Гаспода" (1998) і "Вершы. Каханне. Проза”(2003).
Адным з адметных твораў Леанида Дранько-Майсюка з'яуляецца яго «Паэтаграфічны раман»(2002г.). У “Паэтаграфічным рамане” Леанід Дранько-Майсюк папярэджвае — не варта высвятляць, што такое паэзія, але падрабязна і з задавальненнем распавядае, з чаго яна пачынаецца.

Ты ведаў пра гэта, мой дружа,
Аднак жа не здолеў, не здужаў
Стаяць пры маўклівым крыжы
І, нібы засохлую ружу,
Ты скінуў маўчанне з душы.

Што будзе далей, пакажы —
Якое табе частаванне
Чакае ў халодным тумане…

# Прызнанні Леаніда Дранько-Майсюка

- Лаўрэат прэміі ”Залаты апостраф” (за нізку апавяданняў у часопісе "Дзеяслоў” (2005).
- Член Саюза пісьменнікаў СССР (1984).

- Працягваліся сустрэчы з вядомым пісьменнікам Уладзімірам Караткевічам, і яны мелі для Леаніда Дранько-Майсюка жыццёвае значэнне. Уладзімір Караткевіч прапісаў яго ў сваёй кватэры. Ён мала пражыў, але шмат напісаў. Быў вялікім, нястомным працаўніком! За дзень з-пад яго пяра выходзіла да паўсотні цудоўных старонак. Леаніду давялося бачыць яго рукапісы, на якіх амаль нічога не закрэслена. Ён пісаў так, што кожнае слова адразу знаходзіла сваё месца ў сказе. Як дарагую рэліквію ён захоўвае кнігу з яго аўтографам — раман “Нельга забыць”.

# Водгукі

- Уладзімір Караткевіч называў Леаніда Дранько-Майсюка “паэтам з рысамі рыцара”.
- Па словах Уладзіміра Някляева ўяўленні пра рыцарства Дранько-Майсюка “злучаны з яго стаўленнем да жанчыны, да сяброў, да паэзіі, да Беларусі і ўсяму крэўнаму, беларускаму”.

# Спіс выкарыстаннай літаратуры


- Https://be.wikipedia.org/wiki/Леанід_Васільевіч_Дранько-Майсюк
- Бельскі, А.І. Сучасная беларуская літаратура: Станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80-90-я гг.): Вучэб. дапам.
- Дранько-Майсюк Л. Тут: Вершы, паэмы, /Маст. У.І. Цярэнцьеў. - Мн.: Маст. літ., 1990. – 2014.

# Дзякуй за ўвагу!